ведаў. Колькасць апытаных, якія прытрымліваюцца супрацьлеглай пазіцыі, — 1—2 %.

Такім чынам, з праведзенага сацыялагічнага даследавання бачна, што творчасць дзіцячых фальклорных калектываў цесна суадносіцца з такой формай асваення фальклору, як стылізацыя, да якой адносяцца розныя пастаноўкі. Творчая роля кіраўніка тут надзвычай адказная. Дрэнна стылізаваныя творы выклікаюць у слухачоў пачуццё незадаволенасці. На жаль, іншы раз сцэнічны паказ твораў народнага мастацтва выглядае як «суцэльны феерверк», як відовішча ці забава. Таму стваральнікі апрацовак павінны беражліва ставіцца да захавання фальклорнай першакрыніцы. Каб добра ведаць этнаграфічную спецыфіку твора, яго рэгіянальныя асаблівасці, трэба знаёміцца з адпаведнай літаратурай, а таксама звяртацца да носьбітаў традыцыі.

Этналагічныя і мастацкія веды кіраўніка, які займаецца аднаўленнем фальклору, абавязкова павінны спалучацца з педагагічнымі.

***Р.Ф.Шаура,***
***загадчык кафедры рамёстваў Беларускага універсітэта культуры, кандыдат мастацтвазнаўства, прафесар***

## Стан і шляхі развіцця народнай творчасці на сучасным этапе

Народная творчасць, калі ўзяць увесь перабудовачны перыяд, развівалася па гістарычна адпрацаваных, грунтоўна ўстаялых арганізацыйна-метадычных формах і прынцыпах. Як вядома, існавала шырокая сетка адпаведных інстытутаў, якія забяспечвалі функцыяніраванне сападуладных адзін аднаму ў рэгіянальных і прававых адносінах структур-дамоў народнай творчасці і дамоў мастацкай самадзейнасці са штатным раскладам упраўленцаў, метадыстаў, кансультантаў, мастацтвазнаўцаў. Дзейнасць творчых калектываў — клубаў па інтарэсах, студый, ізагурткоў — цэнтралізавана забяспечвалася кіраўнікамі, педагогамі, кансультантамі. Гэты вялікі пласт мастацкай культуры — народная мастацкая творчасць — функцыяніраваў, развіваўся, абагачаючы ўсю духоўную культуру грамадства. На яго развіццё дзяржава выдзяляла па цяперашніх мерках даволі значныя сродкі, што не магло не ўплываць станоўча на ўвесь сацыяльна-культурны працэс у нашым грамадстве. Работа раённых аддзелаў і абласных упраўленняў культуры, а таксама шырокай сеткі арганізацыйна-метадычных устаноў, у падпарадкаванні якіх знаходзілася народнае і самадзейнае мастацтва, была накіравана на выяўленне народных майстроў і самадзейных мастакоў, правядзенне і арганізацыю навучальнага працэсу, рашэнне пытанняў выставачнай дзейнасці, правядзенне кансультацыйнай работы з творцамі і, што не менш важна, аказанне ім маральнай і матэрыяльнай падтрымкі.

І гэта пры ўсім тым, што для сферы кіравання працэсам развіцця народнай творчасці ў нашай рэспубліцы ні адна навучальная ўстанова спецыяльныя кадры не рыхтавала, сістэма масавага прыцягнення людзей да мастацкай культуры, творчасці функцыяніравала. Зразумела, што ўсю нішу кіраўнікоў, арганізатараў, мета-

дыстаў па пытаннях народнай і самадзейнай творчасці займалі ці прафесійныя мастакі, мастацтвазнаўцы, ці спецыялісты, якія не мелі непасрэдных адносін па сваёй кваліфікацыі да мастацка-творчага працэсу — педагогі, журналісты і г.д.

Таму развіццё народнага мастацтва і самадзейнай творчасці разам са значнымі дасягненнямі ажыццяўлялася не заўсёды ў правільным накірунку. Не выключаліся выпадкі, калі дзейнасць народных майстроў накіроўвалася ў рэчышча відавочнай эклектыкі, кічу і безгустоўнасці. Але гэта было тады, калі віравала жыццё масавай народнай творчасці, не існавала глабальных праблем, якія сёння сталі відавочнымі.

Якія ж сёння існуюць напрацоўкі ў аматарскім выяўленчым мастацтве, што змянілася ў параўнанні з 1970–1980-мі гг. — перыядам яркім, значным, памятным. Скасаванне цэлага шэрага структурных падраздзяленняў у сферы кіравання народнай творчасцю, такіх, як Рэспубліканскі дом народнай творчасці (апошняя назва — Рэспубліканскі навукова-метадычны цэнтр народнай творчасці і культасветработы), Міжсаюзны і абласныя дамы самадзейнай творчасці, а таксама структуры гарадскога маштабу, прывяло да таго, што ў значнай ступені перастала існаваць сувязь працуючых сёння метадычных інстанцый з самадзейнымі майстрамі, творцамі.

Пачынаючы з 90-х гадоў працэс развіцця аматарскага выяўленчага мастацтва стаў набываць адценне «рыначнасці» і «камерцыялізацыі». Час прымушае, каб творцы мелі не толькі чыста душэўную асалоду ад мастацкага працэсу, але маглі атрымаць і матэрыяльную падтрымку ў сённяшнім складаным жыцці. На жаль, часта творы народных майстроў і самадзейных мастакоў з'яўляюцца прадметам скупкі і перапродажу выпадковымі асобамі, якія на гэтым добра зарабляюць. Цікавыя творы перапрадаюцца за мяжу, што, канешне, значна збядняе стан нашай агульнай нацыянальнай культуры.

З усёй вялікай структурнай сістэмы кіравання дзейнасцю масавай мастацкай творчасці ў рэспубліцы засталіся, у асноўным, абласныя, раённыя і гарадскія цэнтры народнай творчасці, упраўленні і аддзелы культуры. Аднак і іх дзейнасць у значнай ступені абмяжоўваецца тымі невялікімі сродкамі, якія выдаткоўваюцца штогод на развіццё гэтай галіны мастацкай культуры.

На змену традыцыйным формам дзейнасці асобных структур, ды і ўсёй сістэмы народнай мастацкай творчасці, прыйшлі і прыходзяць новыя формы работы з майстрамі і самадзейнымі мастакамі. У рэспубліцы пашыраецца сетка дамоў народных рамёстваў, ствараюцца недзяржаўныя структуры, якія на грамадскіх пачатках і пры падтрымцы спонсараў працуюць на ніве народнай мастацкай творчасці. Вось ужо звыш пяці год у рэспубліцы функцыяніруе Саюз майстроў народнай творчасці. Ён стаў галоўным каардынацыйным цэнтрам у галіне традыцыйнага мастацтва, вядзе ўсю арганізацыйна-творчую і метадычную работу з народнымі мастрамі рэспублікі. Ужо напрацаваны пэўны вопыт у гэтым накірунку і можна з упэўненасцю сказаць, што Саюз майстроў народнай творчасці разам з іншымі структурамі галіны культуры здолее ўзняць на новы ўзровень развіццё народнага мастацтва ў нашай рэспубліцы.

Створаны ў 1991 г. Беларускі інстытут праблем культуры аб'яднаў у сваёй дзейнасці функцыі галоўнай навукова-даследчай і ў пэўнай ступені навукова-метадычнай установы ў сферы культуры. За гэты перыяд ім шмат зроблена для



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

развіцця народнай і самадзейнай творчасці менавіта ў новым, сучасным накірунку.

Былі і страты падчас сацыяльна-культурнай перабудовы і рэканструкцыі сістэмы кіравання народнай творчасцю. Напрыклад, на працягу амаль што 50 гадоў назапашваліся фонды твораў народнага і самадзейнага мастацтва па лініі Рэспубліканскага дома народнай творчасці, а пазней і Дома мастацкай самадзейнасці. Яны маглі б сёння стаць цікавымі экспанатамі выставы любога ўзроўню. Гэта быў найкаштоўнейшы набытак як у гістарычным, так і ў мастацкім сэнсе. Але дзе гэтыя фонды, што па крупінцы збіраліся на працягу доўгага часу? Разам з расфарміраваннем упраўленчых інстытутаў яны былі знішчаны, ці больш праўдзіва сказаўшы, раскрадзены.

Аднак не хацелася б на песімістычнай ноце заканчваць гэту размову. Народная творчасць незалежна ад улады, матэрыяльнага становішча дзяржавы і іншых абставін развіваецца па сваіх аб'ектыўных законах — патрэбы чалавека ствараць прыгожае. І гэта патрэба ў творчасці была і застаецца самай трывалай дамінантай у жыццяздольнасці і нязгаснасці народнай мастацкай культуры.

***Я.М.Сахута,***
***старшыня праўлення Беларускага саюза майстроў народнай творчасці, доктар мастацтвазнаўства***

## Нацыянальная выстаўка народнай творчасці: набыткі і пралікі

Як заключны этап Першага фестывалю народнага мастацтва «Беларусь — мая песня», Нацыянальная выстаўка народнай творчасці «Жывыя крыніцы» стала маштабнай і прадстаўнічай дэманстрацыяй становішча і характару важнейшага раздзела нацыянальнай культуры. Прасторныя залы Рэспубліканскай мастацкай галерэі (Палаца мастацтваў) ледзь умясцілі дзве тысячы твораў звыш шасцісот майстроў з усіх куточкаў Беларусі. Падобныя выстаўкі не наладжваліся ўжо добры дзесятак гадоў.

У прынцыпе, такога выніку можна было чакаць. Работа па падрыхтоўцы выстаўкі (як і фестывалю ў цэлым) не пакінула абыякавым, здаецца, ніводнага работніка культуры. Перад імі была пастаўлена канкрэтная задача: не прапусціць ніводнай цікавай з'явы ў галіне народнай творчасці, не абысці сваёй увагай ніводнага майстра. Выстаўкі мясцовай народнай творчасці яшчэ ў пачатку гэтага года былі наладжаны ў многіх сельскіх, пасялковых, гарадскіх дамах і палацах культуры, лепшае з прадстаўленага склала аснову абласных выставак. Сцвярджаць, што не прапусцілі ніводнага майстра, наўрад ці рэальна, а што свае таленты прадэманстравалі практычна ўсе раёны — бадай што так. Гомельшчына і Міншчына свае выстаўкі так і пабудавалі — асобна па кожным раёне. Арыгінальная канцэпцыя — у адпаведнасці з каляндарным цыклам — аб'ядноўвала экспазіцыю Віцебшчыны. Віцебчане нават змаглі выдаць прыстойны каталог.

Усё лепшае і было прадстаўлена ў экспазіцыі Нацыянальнай выстаўкі «Жывыя крыніцы». Звычайны глядач, завітаўшы ў Палац мастацтваў, мог пабачыць



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ